6. Тарасаў, С.В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIIIстст. / С.В. Тарасаў // ГАППЗ // Матэрыялы IV міжнар. навук. канф., Полацк. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 267–272.
7. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX-XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.

**УДК 392.1(476)**

## ГАРАДСКІ ЛАНДШАФТ У ТРАДЫЦЫЙНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ[1]

***канд. гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўнверсітэт)***

*Разгледжана сімволіка гарадскога ландшафту ў яго архітэктурным і сацыяльным вымярэннях у традыцыйнай карціне свету беларусаў Віцебшчыны. Фальклорнаэтнаграфічныя крыніцы паказваюць, што горад ва ўяўленнях вяскоўцаў характарызуецца амбівалентным чынам. Як максімальна ўпарадкаванае месца з вялікай колкасцю храмаў, горад можа атаясамлівацца са "святым месцам". З другога боку, шчыльнасць забудовы, гіганцкія архітэктурныя формы, экалагічная забруджанасць і сацыяльная дэзарыентацыя вяскоўца ў горадзе ляжаць у аснове яго негатыўных характарыстык як прасторы некамфортнай для жыццёвай дзейнасці чалавека.*

Вёска і горад з’яўляюцца аднымі з базавых элементаў еўрапейскага культурнага ландшафту, фармаванне якога цесным чынам звязана з гісторыяй развіцця аграрных супольнасцяў, сацыя-эканамічных, палітычных інстытутаў дзяржавы і ўласна феномена горада. Беларускі культурны ландшафт, як арганічная частка еўрапейскага, у гэтым сэнсе не з’яўляецца выключэннем. Функцыянальная нагрузка вёскі (сельскагаспадарчая вытворчасць) і горада (асяродак рамяства ці прамысловасці, улады, адміністрацыі, афіцыйнай рэлігіі, “высокай культуры”) у структуры грамадства наклалі выразны адбітак на аблічча (ландшафт) абодвух тыпаў населеных пунктаў. Нават знешняе, візуальнае ўспрыняцце фіксуе, што архітэктурны сілуэт вёскі арганічна ўпісаны ў прыродны асяродак і практычна зліваецца з ім, а ландшафт горада рэзка вылучаецца з прыроднага кантэксту і дамінуе над ім. Адасобленасць, адмежаванасць горада ад свету прыроды акцэнтуецца і падкрэслена штучным матэрыялам яго канструявання, які не мае прыродных адпаведнікаў і не ўласцівы вёсцы ў якасці асноўнага будаўнічага матэрыялу.

Найбольш архаічны пласт міфалагічных уяўленняў адносна горада грунтуецца на яго ўспрыняцці як максімальна ўпарадкаванага і арганізаванага прасторавага локуса, абмежаванага і падкрэслена адмежаванага ад знешняй (хаатычнай, неарганізаванай) прасторы, што знаходзіць сваё адлюстраванне на лексічным узроўні (ст.-слав. градъ, параўн. літ. gařdas ‘агароджа’, ст.-інд. grhás ‘дом’). У гэтым сэнсе горад тоесны агароджанай сядзібе і ўвасабляе сабой уласна чалавечы свет. Паказальнай з’яўляецца старажытнагерманская мадэль свету, дзе “свет людзей мысліцца як жыллё, дом, сядзіба. <…> Гэта “сярэдзінны двор” (miđgarđr), і гэткі ж, уласна, і сьвет асаў (язычніцкіх багоў скандынаваў) – ásgarđr. Гэты “Сярэдзінны двор” з усіх бакоў абступае “сьвет за агароджай” (útgarđr), прыстанішча веліканаў і іншых дэманічных сілаў” [1, с. 148].

Цэнтральнае месца горада ў міфапаэтычнай сістэме прасторавых каардынат азначаў і яго вышэйшы сакральны статус. Як адзначыў У. М. Тапароў, “звяртаюць на сябе ўвагу тыя абставіны, што горад арганізуецца (і адпаведна разглядаецца ў міфапаэтычнай традыцыі) як рытуальны цэнтр, як храм, месца ахвярапрынашэння, алтар. Ізамарфізм усіх гэтых структур выразна ўсведамляўся архаічнай міфапаэтычнай думкай, і колькасць гэтых сведчанняў у гэтай вобласці надзвычай вялікая” [2, с. 129].

Сакральны статус горада знаходзіў пацвярджэнне, асабліва для чалавека вясковага, і візуальна. Сілуэт горада дамінуе ў навакольнай прасторы, горад бачна здалёк (вёска можа “хавацца” ў лесе), ён, як і ростані, замыкае на сабе дарогі (ніколі ў горад не вядзе толькі адна дарога, у той час, як для вёска гэта, хутчэй, з’яўляецца нормай). Яго храмы, палацы, камяніцы, арыентаваныя вертыкальна, “да неба”, у візуальным успрыняцці стваралі ўражанне “ўзвышанасці” горада ў прасторы культурнага ландшафту. Такім чынам, горад быў “вышэй” за вёску нават у прасторавым вымярэнні, што за для чалавека традыцыі было сутнасным знакам яго сакральнай вылучанасці.

Так, у Паўночна-Усходняй Беларусі персаніфікаванае свята – Каляда – прыязджае ў свет людзей, каб адарыць іх, менавіта з Полацку: “Ехала Каляда з Полацку / Да на сівенькім конічку. / Прывезла рэшата бліноў, / Паставіла на стале, / А Раштво пасадзіла на куце” [3, с. 128]. У рэальным жыцці сакральнымі цэнтрамі прыцягнення вяскоўцаў былі гарадскія храмы і манастыры, якія нярэдка славіліся свамі цудадзейнымі рэліквіямі – абразамі ці машчамі святых. Яскравым прыкладам “святога горада” выступае Полацк, чый сакральны статус не ў малой ступені быў звязаны з культам Прападобнай Ефрасінні і масавых

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках тэмы ГБ 0814 «Этнакультурны ландшафт Беларускага Падзвіння: рэгіянальная спецыфіка і заканамернасці функцыянавання ў другой палове XIX – пачатку XXI ст.»

паломніцтваў да яе мошчаў, што захоўваюцца ў Спаса-Ефрасіньеўскім манастыры. Пры гэтым заўважым, што ў дарэвалюцыйную эпоху вясковец меў толькі дзве асноўных нагоды наведаць горад – храм і кірмаш, якія ў роўнай ступені суаднесены з катэгорыяй святочнага часу. Гэта значыць, што ў традыцыйнай карціне свету горад уяўляў сабой сакральна вылучаны хранатоп, дзе святыя месцы (храмы) і святочны час былі непарыўна звязаны паміж сабой.

Але нават калі вясковы чалавек трапляў у далёкі, незнаёмы горад, і трапляў не як паломнік, а савецкі экскурсант, то ўсё адно яго ўвагу найперш прыцягваў велічны храм: "Была ў Ленінградзе. Там очэнь інцерэсна. Была ў Ісакаеўскім саборы. Там шар такі, як сонца ходзіць, адно золата там. Прама толькі стаяў бы і глядзеў бы на гэты сабор"[2].

У другой палове XX ст. архітэктурны ландшафт беларускіх гарадоў радыкальным чынам змяняецца. Імклівая ўрбанізацыя і прамысловае будаўніцтва, а таксама палітыка барацьбы з рэлігіяй ствараюць новыя архітэктурныя дамінанты горада: замест храмаў – шматпавярховыя жылыя дамы, прадпрыемствы, коміны ТЭЦ. У Полацку згаданая метамарфоза ўвасобілася ў разбурэнні сабора св. Стэфана (Мікалая) і будаўніцтве на месцы храма высотнага "дома з вушамі".

Імклівы рост гарадоў як у гарызанталі, так і вертыкалі, калі пачынае дамінаваць тыпавая, безаблічная архітэктура, спараджае ў вяскоўцаў адчуванне хаосу і дэзарыетнтацыі ў гарадской прасторы. Кватэра дзяцей (яе памеры, камфортнасць) з аднаго боку робіцца прадметам гонару ў размовах з аднавяскоўцамі, але, парадаксальным чынам, выступае як эрзац-жыллё, калі даводзіцца пагасціць у ёй. Характэрным з'яўляецца суаднясенне вясковым чалавекам гарадской кватэры з "турмой", калі сама структура шматкватэрнага дома нагадвае мноства камер у месцы зняволення. "У горадзе цюрма. На сядзьмом этажу сядзіць тама дзень і ноч. – Дык цёпла ж, вада гарачая ёсць, рабіць не трэба нічога... – Ай, лучшэ работаць, чым сядзець. Я люблю работаць. Летам, глазы плахія – мне нельзя работаць, а я люблю, штоб усё ў градках было, штоб усё расло. З дзецтва зямлю люблю і цяпер люблю зямлю. У мяне ўсё сваё. А там эта на седзьмым этажэ сядзіць, як у цюрме"[3]. Але сутнасць такога параўнання больш глыбокая: у гарадской кватэры чалавек ізаляваны ад знешняга свету, не здольны кантраляваць статычныя межы жытла і, тым больш, выкарыстоўваць іх з мэтай утылітарнага і сімвалічнага ўзаемадзеяння з вонкавым светам. Заўважым, што практычна ўсе канструктыўныя контуры вясковай хаты (парог, дзверы, акно, сцяна, страха), якія валодаюць межавым статусам, актыўна выкарыстоўваюцца ў магічных аперацыях народнай медыцыны альбо ў рытуальна напружаных сітуацыях. Так, валачобнікі, калядоўшчыкі, а таксама старцы ("божыя людзі") пачыналі дыялог з гаспадарамі дома менавіта праз вакно, якое ў міфапаэтычнай карціне свету ўвасабляе канал камунікацыі з сакральнай сферай. Уявіць рэалізацыю падобнага рытуальнага сцэнарыя ў гарадской кватэры на трэцім ці дзявятым паверсе проста немагчыма.

Нават уласна арганізацыя жыццёвай прасторы вясковага дома і гарадской кватэры сутнасна адрозніваюцца паводле крытэрыяў традыцыйнай карціны свету. Камфорт кватэры, безумоўны для гараджаніна, з'яўляецца даволі спрэчным для вяскоўца: "Вот не хачу [ў горад]. Залатая мама мая, нябожчыца, паехала к сыну ў горад. І кажэць, во кухня, а во туалет. Нада іці туды [у туалет], а тут радам ядуць, а тут нада іці што робіць"[4]. Адзначым, што непрыняцце падобных прынцыпаў гарадской арганізацыі жыллёвай прасторы, калі санвузел непасрэдна мяжуе з кухняй, мае трывалы, стэрэатыпны характар і амаль аднолькава фіксуецца ў розных раёнах Віцебшчыны: "Эта очань цяжола прывыкнуць стараму чалавеку к гораду. Прымерна, у нас туалет, у мяне там чыста, акуратна. Я пашла. А там? Тут кухня, тут туалет. Зяць сядзіць есьць, а баба, усе ж людзі, пойдзець у туалет? Ці нада ждаць, калі той зяць з кухні выйдзець ды пойдзець куды-небудзь. Вот этага я не перэварываю!"[5].

Архітэктоніка горада, асабліва сучаснага, вызначаецца рознымі варыянтамі спалучэння і камбінавання гіганцкіх, з гледзішча вясковага чалавека, форм (шматпавярховыя дамы, адміністрацыйныя ўстановы, гандлёвыя і вытворчыя комплексы і г.д.). У сваю чаргу, архітэктоніка вёскі характарызуецца мінімалізмам формаў. Нягледзячы на маштабнасць гарадской архітэктуры, яна, за малым выключэннем (храмы), існуе па-за сістэмай прасторавых каардынат, уласцівай міфапаэтычнай карціне свету, у той час як вясковая сядзіба не проста звязаная з наяўным касмічным парадкам, але і сама рэпрэзентуе яго, выступаючы ў любой рытуальна значнай сітуацыі мікрамадэллю Космаса. Такім чынам, магчымасці чалавека весці дыялог са светам у яго касмічнай праекцыі ў горадзе вельмі моцна абмежаваныя, што асабліва выразна бачна ў сітуацыях крытычных, звязаных з пэўнымі дэвіяцыямі ў жыцці чалавека, для выпраўлення якіх, прынамсі па разуменні вяскоўца, неабходны сімвалічны кантакт з тагасветам. "Тожа нада вот, як увідзіш первы раз эту пілепсію, тады ірві на яго гэту адзежу, і вот, ну як у горадзе дык цераз дом не перакінеш жа, бальшы дом. Ну дык так во – кінуў [цераз хату] і закапаў яе, дзе кінуў, там і закапы-

[2] Зап. Матошка А. у 2010 г. ад Каросцік Леаніды Ўладзіміраўны, 1950 г. н. у в. Свіркі Докшыцкага р-на.
[3] Запісаў аўтар (ЗА) у 2007 г. ад Васільевай Марыі Гаўрылаўны, 1928 г. н. у в. Пруднікі Віцебскага р-на.
[4] ЗА у 2014 г. ад Кундук (Карбань) Зінаіды Мікалаеўны, 1930 г.н. у в. Свядзіца Лепельскага р-на
[5] ЗА у 2014 г. ад Раўковай Галіны Сідараўны, 1927 г.н. у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на.

вай”[6]; “Дзічы? Тожа загаварваю. Малюся Богу, нітачкі вяжу, закапваюць вот. Адну нітачку закапаць, а другую палажыць, дзе газ. Яна тлеіць… і сатлеіць. Ну не сразу, пасцепенна. Вот тут пліта прымерна, а тут палажыў, яна тлеіць і сатлеіць. А тут, дзе ходзіце, ну ў вас там у горадзе дык няма ж гэта зямлі, як у нас гэта зямля пад парогам, нада хадзіць пака не згніецць яна” [4, с. 120].

Не меншае значэнне ва ўспрыняцці горада адыгрывае і яго сацыяльны ландшафт, які для вяскоўца ёсць безаблічным, ананімным і слаба пазнавальным, што робіць сацыяльныя повязі жыхара вёскі ў горадзе пасіўнымі і маргінальнымі. І нават такая знакавая падзея ў быцці вёскі, як пахаванне чалавека, у горадзе ўспрымаецца зусім іначай. “Да, была я у Мінску. У сястры дваюраднай, яна мне шыець. Я крычу: – Яна, Яна, глянь! Хто там памер? Вянкі вунь панеслі! Мусі, малады, дзеці пашлі. Яна кажыць: – Слухай, глядзі і маўчы, не атвлякай мяне. Не мяшай мне, глядзі сабе, хто куды пайшоў. Гэта ж цябе не ў дзярэўні, што ты знаеш хто памёр”[7]. Выдатная арыентацыя ў рамках сваёй, вясковай супольнасці і дэзарыентацыя ў сацыяльнай прасторы горада задаюць розныя магчымасці пры выпраўленні збояў і парушэнняў у жыцці чалавека. Бо важным стае не толькі актуалізацыя межавой сімволікі пэўнага прасторавага локуса, але і зварот да чалавека, які ўвасабляе міфалагічнае памежжа ў сацыяльным вымярэнні. Прасцей кажучы, пошук знахара, які і ёсць “аператарам” паміж “гэтым” і “тым” светам, складае ў горадзе значную праблему, але ў інфармацыйным полі сацыяльнага ландшафту вёскі адбываецца, як правіла, даволі проста. “Я сама з Наваполацка. У мяне і кварціра там… І вот врачы лечылі, рука ў яе была.., рожу і врачы сказалі: “Ідзі бабку ішчы!” Тожа па гораду, знаеце, як этых бабак іскаць, не знаўшы” [4, с. 38].

Індывідуалізм, замкнёнасць і адсутнасць скразной міжасабовай камунікацыі і шчыльных сваяцка-суседскіх сувязяў расцэньваюцца вяскоўцамі як адмоўныя рысы гараджан. І наадварот, кожны суб’ект сацыяльнага ландшафту вёскі не мае ніякіх праблем з ідэнтыфікацыяй іншых суб’ектаў, і сам вычарпальна характарызуецца з боку вясковай супольнасці з улікам сваіх соцыя-культурных роляў, сваяцкіх повязяў і маральна-этычнага вобліку. “Толькі ў дзяреўне, канешна, спокойнее многа, і людзі больш добрыя. Мы ўсе знаем друг друга, мы все як родсцвеннікі между сабой. Мы знаем не толькі друг друга, мы знаем дажа і детей, і старшых, мы ўсе друг друга знаем. Поэтому все очэнь дружны между собой. Гаражане, ані болей такія індывідуалісты. Кажды ў сваей скарлупе, кажды ў сваёй кварцірке. Нет такого дабражэлацельства, нет такога абшчэнія между сабой, і некаторыя могуць пражыць у горадзе многа лет і не знаць, хто у іх у под’ездзе жыве, не так як мы в дзярэўні знаем всех абсалютна”[8].

Разам з тым, трэба адзначыць, што антыномія “вёска” – “горад”, прадстаўленая апазіцыяй “вясковы дом” – “гарадская кватэра”, на сучасным этапе ў значнай ступені змяняе сваю палярнасць. Калі ў 1960–1980-х гг. для вяскоўца, што выехаў жыць і працаваць у горад, асабістая кватэра з’яўлялася ўвасабленнем жыццёвага поспеху і высокага сацыяльнага статуса, то з пачатку 2000-х гг. набывае моц іншы каштоўнасны вектар: ідэалам чалавечага жытла ізноў становіцца вясковы (загарадны) дом, але на гэты раз у вышэйшай ступені камфортны.

ЛІТАРАТУРА

1. Гуревич, А. Я. Диалектика судьбы у германцев и древних скандинавов / А.Я. Гуревич // Понятие судьбы в контексте разных культур / Научн. совет по истории мировой культуры. – М. : Наука, 1994. – С. 148–156.
2. Топоров, В.Н. Заметки по реконструкции текстов / В.Н. Топоров // Исследования по структуре текста. – М. : Наука, 1987. – С. 99–132.
3. Зімовыя песні / рэд. М.Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка,1975. – 736 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік : у 2 ч. / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Вып. 1 Народная медыцына беларусаў Падзвіння. – Ч. 2. – 332 с.

**УДК 72.03(476+477+470+571)"15/19"**

## ТРАДИЦИОННЫЕ ХОЗЯЙСТВЕННЫЕ ПОСТРОЙКИ ИЗ ЛЕГКИХ КОНСТРУКЦИЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ И СОСЕДНЕГО ЗАРУБЕЖЬЯ В XVI – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XX В.

***канд. ист. наук, доц. С.А. МИЛЮЧЕНКОВ***
***(Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси, Минск)***

*Исследование выполнено при поддержке БРФФИ № Г15Р-003. Рассматриваются традиционные сельскохозяйственные и предназначенные для хранения домашнего имущества постройки из легких кон-*

[6] ЗА у 2008 г. ад Каваленка Соф’і Рыгораўны, 1930 г. н. (нар. у в. Белыя Баркі Крупскага р-на) у в. Грыгаравічы Чашніцкага р-на.
[7] ЗА у 2014 г. ад Калатоўкінай Вольгі Іосіфаўны, 1940 г.н. у в. Казімірова Полацкага р-на
[8] Зап. Камінскі С. у 2014 г. ад Заенка Валянціны Паўлаўны, 1936 г.н. у в. Казімірова Полацкага р-на.